Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 9 (133) Серада, 21 сакавіка 1990 года

## ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ: ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

### ШТО АЦЭНЬВАЕ ЭКЗАМЕН?

Надыйшла вясна — нялёгкі час для пяцікурснікаў. У хуткім часе мы павінны будзем пацвердзіць веды, атрыманыя за гады вучобы ва універсітэце. У нашым грамадстве адбываюцца вялікія перамены, а што змянілася ў адносінах да ацэнкі ведаў студэнтаў, якія заканчваюць вышэйшую навучальную ўстанову?

Доўгія гады студэнты, акрамя дыпломнай работы ці дзяржэкзамена па спецыяльнасці, здавалі экзамен па марксізму-ленінізму. Не можам адразу адказаць на пытанне: «З якой мэтай праводзіўся такі экзамен? Ці то была ацэнка палітычнай свядомасці выпускніка, ці то адданасці пэўным ідэалам?» Кожны чалавек, які разважае, разумее, што ні тое, ні другое гэтым экзаменам не ацаніць. Але раней так думаць забаранялася, таму што нейкі чынуша прыняў аднойчы рашэнне — «Трэба».

У гады перамен студэнты пачалі барацьбу супраць непатрэбнага экзамена. Патрабавалі яго адмены, менавіта патрабавалі, а не прасілі. Так, нам пайшлі на ўступкі. Але на што змянілі? На экзамен па марксісцка-ленінскай філасофіі або па навуковаму сацыялізму. Змянілі, адным словам, хрэн на рэдзьку. Але ж, як вядома, адно за другое не саладзей. І вось тое, ці атрымаем дыпломы спецыялістаў па матэматыцы, фізіцы або біялогіі, у многім будзе залежыць ад таго, як здадзім гэты экзамен...

Мы, студэнты, лічым, што больш неабходна вывучаць сёння курсы па эканоміцы і паліталогіі. Трэба вучыцца працаваць, а не толькі размаўляць. Курсы па навуковаму сацыялізму, камунізму, марксісцка-ленінскай філасофіі можна прачытаць як факультатыўныя для тых, каму гэта цікава. Аб экзаменах тут і гаворкі не можа быць...

**Група студэнтаў дзяржуніверсітэта.**

### УНІВЕРСІТЭТ БЕЗ ГРАМАДСКІХ НАВУК?

У нататках «Давайце падумаем», на мой погляд, выказаны, наогул, справядлівыя прэтэнзіі да зместу і методыкі выкладання грамадскіх навук. Гэтыя прэтэнзіі, дарэчы, не новыя. Яны выказваюцца сёння і студэнтамі, і многімі выкладчыкамі-грамадазнаўцамі. І тых і іншых у аднолькавай меры не задавальняюць праграмы грамадазнаўчых дысцыплін галоўным чынам у тым сэнсе, што ў іх не пераадолена дубліраванне, адарванасць ад існуючай рэчаіснасці і сусветных дасягненняў грамадска-палітычнай думкі, адкрытая або закамуфліраваная апалагетыка існуючых парадкаў, кансерватызм і дагматызм.

Аўтары ставяць пытанне аб мэтазгоднасці дзяржаўнага экзамена па грамадскіх навуках на прыродазнаўчых факультэтах. Думаю, што ў парадку абмеркавання ўзняцце і такога пытання магчыма.

Але ёсць адно, у чым я не згодны з аўтарамі ў іх пазіцыі — гэта яўная неканструктыўнасць, прэтэнзіі на адзіна існуючую ісціну, якімі дыхае кожны радок нататкаў. А між іншым, пастаўленая праблема патрабуе сур'ёзнага асмыслення.

На мой погляд, перабудова выкладання грамадскіх навук патрабуе вырашэння наступных пытанняў.

Трэба вырашыць, ці ёсць неабходнасць выкладаць грамадскія навукі ва універсітэце. Калі так, то што выкладаць і як выкладаць?

Станоўчы адказ на першае пытанне для мяне відавочны. Думаю, што гэтую думку падзяляюць і аўтары нататак, паколькі сацыяльна-палітычныя і гуманітарныя дысцыпліны — неад'емная частка вучэбных планаў вышэйшых навучальных установаў ва ўсіх краінах. Так, напрыклад, у Масачусэцкім тэхналагічным інстытуце (ЗША) ў вучэбных планах спецыяльнасцяў сацыяльна-палітычныя і гуманітарныя дысцыпліны займаюць амаль 16%, а ва універсітэтах — нават да 25—30%.

Зыходзячы з гэтага, лічу, што чатыры грамадскія дысцыпліны, уключаныя сёння ў вучэбныя планы нашага універсітэта як абавязковыя, з'яўляюцца неабходнай падставай для падрыхтоўкі спецыялістаў.

Іншая справа, як выкладаць гэтыя дысцыпліны. Паколькі маем магчымасць замяняць 50% тэм дзяржаўнай праграмы тэмамі, якія больш актуальныя з пункту гледжання студэнтаў і кафедр, уводзіць спецкурсы і спецсемінары, і, на мой погляд, ёсць усе ўмовы для таго, каб даць студэнтам веды, якія будуць неабходны ім у жыцці, працоўнай дзейнасці. Ужо ёсць першыя крокі ў гэтым напрамку. Так, на кафедры навуковага сацыялізму распрацавана праграма, і студэнты фізічнага факультэта слухаюць спецкурс «Паліталогія». Такія ж спецкурсы распрацоўвае кафедра філасофіі і іншыя кафедры грамадскіх навук.

На мой погляд, нам трэба змяняць практыку вядзення практычных заняткаў. Трэба, каб на семінарах студэнт працаваў самастойна, прыходзіў сюды не для таго, каб паўтарыць тое, што напісана ў кніжцы, а абмеркаваць менавіта тыя пытанні, якія хвалююць. Трэба таксама пашыраць спецкурсы і спецсемінары па гісторыі сацыяльна-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі, Расіі, па культуры беларускага народа. Упэўнены, што, калі мы гэта зробім, то падобныя меркаванні адносна сацыяльна-палітычных навук, іх выкладання, неабходнасці для будучага спецыяліста не будуць мець месца сярод студэнтаў.

І апошнія заўвагі.

Аўтары нататкаў лічаць, што многія недахопы ў выкладанні сацыяльна-палітычных навук звязаны з тым, што пэўная частка выкладчыкаў супраць усякіх змен, бо апошнія могуць пазбавіць іх куска хлеба. Не згодны з гэтым. Справа ў тым, што, каб змяніць становішча, патрэбны пэўны час, вялікая інтэлектуальная праца выкладчыкаў. Але ўсё гэта магчыма, і, я ўпэўнены, што мы ўсё гэта здзейснім.

Аўтары не падпісалі нататкаў, бо пабаяліся помсты. Дарэмна, бо такія выступленні не толькі магчымы, але і неабходны. Яны стымулююць грамадскую думку, нашу актыўнасць наогул. Ды і ісціна прыходзіць у спрэчках.

**С. ГАБРУСЕВІЧ,**
**прарэктар па вучэбнай рабоце.**

### У В А Г А!

**Універсітэцкае Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны аб'яўляе збор добраахвотных ахвяраванняў у фонд школьных бібліятэк беларускага насельніцтва ў Польшчы. Прымаюцца фінансавыя сродкі і кніжныя выданні.**

**З прапановамі і ахвяраваннямі звяртацца на кафедру беларускай літаратуры, п. 403.**

## АБ СТАНЕ І МЕРАХ ПА ПАЛЯПШЭННЮ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ГОРАДА МЯСАПРАДУКТАМІ

Пастанова бюро Гродзенскага гаркома КПБ і выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў ад 1 сакавіка 1990 года.

За апошні час гарадскі камітэт партыі, выканком гарсавета неаднаразова звярталіся да абласных арганізацый і кіраўніцтва аблвыканкома з прапановамі аб вырашэнні шэрагу сацыяльна-эканамічных пытанняў. Адной з вострых праблем з'яўляецца забеспячэнне гараджан прадуктамі харчавання, асабліва мяснымі.

Так, спажыванне мясапрадуктаў на аднаго жыхара горада за тры апошнія гады ўзрасло ўсяго на 3,6 кг, ці на 5,9%, і склала ў 1989 годзе 64,3 кг. У той жа час насельніцтва горада за гэты перыяд узрасло на 9,7%, штогадовы прырост яго складае каля 10 тысяч чалавек. Фонды, даведзеныя гораду на цякучы год, дазваляюць забяспечыць насельніцтва з улікам росту яго колькасці ў размеры 61,7 кілаграма на чалавека. Пры гэтым пастаўкі мясапрадуктаў з Гродзенскага мясакамбіната ў саюзна-рэспубліканскія фонды застаюцца значнымі. Больш таго, ёсць неадзінкавыя факты пераадрасовак паставкі лішкаў калбасных вырабаў з Масквы, і рэалізацыі іх у г. Бранску, Каломне і інш. Адсутнасць мясапрадуктаў у неабходнай колькасці і асартыменце ў горадзе выклікае справядлівую крытыку ў адрас партыйных і савецкіх органаў, стварае вострую сацыяльную напружанасць.

Кіраўніцтва аблвыканкома неаднаразова на розных абласных нарадах і актывах падвяргалася крытыцы за ігнараванне дэпутацкай грамадскасці, выканкомаў, гарадскога і раённых Саветаў пры прыняцці рашэнняў. Аднак, у цяперашні час падобная практыка працягваецца.

Падведамасныя аблвыканкому службы не арыентаваны на змяненне грамадска-палітычнай сітуацыі, якая склалася ў горадзе Гродна, па-ранейшаму захоўваецца кулуарны, аднаасобны падыход да рашэння гарадскіх праблем.

Адначасова бюро гаркома КПБ і выканком гарсавета адзначаюць, што кіраўнікамі шэрагу прадпрыемстваў і арганізацый горада не надаецца належнай увагі развіццю падсобных гаспадарак, садаводчых таварыстваў. Не да канца вырашаны пытанні збору ад насельніцтва лішкаў прадуктаў, якія вырашчаны на садовых і прысядзібных участках. Недастатковая дапамога аказваецца прадпрыемствам гандлю, грамадскага харчавання ва ўмацаванні іх матэрыяльнай базы і вырашэнні харчовых праблем у горадзе. Раздзяляючы хваляванне жыхароў горада за недастатковае забеспячэнне прадуктамі харчавання і згодна з перадвыбарчай праграмай гарадской партыйнай арганізацыі, бюро гаркома КПБ і выканком гарадскога Савета народных дэпутатаў пастанаўляюць:

1. Адзначыць, што кіраўніцтва выканкома абласнога Савета народных дэпутатаў своечасова не выявіла належнай настойлівасці і прынцыповасці перад вышэйстаячымі рэспубліканскімі органамі ў адстойванні больш справядлівага падыходу пры фарміраванні фондаў мясапрадуктаў у параўнанні з іншымі абласцямі рэспублікі.

Прапанаваць выканкому абласнога Савета народных дэпутатаў (т. Арцыменя Д. К.) з удзелам кіраўніцтва горада (першы сакратар гаркома партыі т. Забродскі Г. А., старшыня гарвыканкома т. Кудравец В. М.) ўвайсці з афіцыйным хадатайніцтвам ва ўрад рэспублікі і ЦК Кампартыі Беларусі аб пераглядзе планавых паставак мясапрадуктаў у саюзна-рэспубліканскі фонд.

У выпадку непрымання неабходных рашэнняў па паляпшэнню забеспячэння прадуктамі харчавання насельніцтва горада Гродна прасіць працоўны калектыў і пярвічную партыйную арганізацыю Гродзенскага мясакамбіната з красавіка 1990 года прыпыніць адгрузку мясапрадуктаў у саюзны фонд.

2. У мэтах эфектыўнай каардынацыі работы прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання горада хадатайнічаць перад аблвыканкомам аб аб'яднанні фондаў, якія выдзяляюцца ўпраўленнямі гандлю і грамадскага харчавання аблвыканкома, з улікам патрабаванняў гараджан; фарміраванне іх ажыццяўляць з удзелам выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў.

3. Даручыць членам КПСС генеральнаму дырэктару абласнога вытворчага аб'яднання «Мясамалпрам» т. Рындаву Н. В., дырэктару мясакамбіната т. Грышуку А. Г. на працягу сакавіка г. г. вырашыць пытанне аб павелічэнні паставак мяса ў дзіцячыя дашкольныя ўстановы.

У мэтах павышэння якасці і пашырэння асартыменту выпускаемай прадукцыі ў 1990 годзе ажыццявіць практычныя меры па тэхнічнаму пераўзбраенню і рэканструкцыі мясакамбіната.

4. Унесці прапанову выканкому абласнога Савета народных дэпутатаў у сакавіку 1990 года на старонках газеты «Гродненская правда» надрукаваць адпаведную інфармацыю аб аб'ёмах вытворчасці, памерах паставак мясапрадуктаў у саюзна-рэспубліканскі фонд і на мясцовы рынак у параўнанні з іншымі абласцямі рэспублікі.

5. Абавязаць планавую камісію гарвыканкома, сацыяльна-эканамічны аддзел гаркома КПБ, раённыя камітэты партыі, выканкомы раённых Саветаў народных дэпутатаў, пярвічныя партыйныя арганізацыі, гаспадарчых кіраўнікоў забяспечыць практычнае вырашэнне пытанняў далейшага развіцця падсобных сельскіх гаспадарак на прамысловых прадпрыемствах і ў арганізацыях.

Пастаянна праяўляць клопат аб павелічэнні вытворчасці прадукцыі ў асабістых падсобных гаспадарках грамадзян, далучэнні гарадскіх жыхароў у садаводчыя таварыствы, стварэнні ім неабходных умоў для вырошчвання сельскагаспадарчых культур і самазабеспячэння прадуктамі харчавання.

6. Даручыць камуністам-старшыням выканкомаў гарадскога Савета народных дэпутатаў т. Кудраўцу В. М., Ленінскага і Кастрычніцкага раённых Саветаў народных дэпутатаў т. Макарэвічу В. Е., т. Школьнік Л. В. у сакавіку г. г. распрацаваць комплексныя мерапрыемствы па рашэнню ўсіх сацыяльна-эканамічных праблем горада і ўнесці адпаведныя прапановы выканкому абласнога Савета народных дэпутатаў.

**Г. ЗАБРОДСКІ,**
**сакратар Гродзенскага гаркома Кампартыі Беларусі,**

**В. КУДРАВЕЦ,**
**старшыня выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў.**

У ГОСЦІ ДА БІЁЛАГАЎ

# НАВАСЕЛЛЕ, ЯКОЕ НЕ ПРЫНЕСЛА



**Студэнтаў-біёлагаў 2-га курса першай групы мы засталі на практычных занятках у лабараторыі фізічнай хіміі.**

**Усе тут, як кажуць, былі пры справе. А як жа інакш! Па-першае, цікава, а па-другое — якая вучоба без сістэматычнай, усебаковай практыкі!**

У канцы снежня мінулага года біёлагі адзначылі наваселле. Нарэшце ім пабудавалі новы корпус, дзе яны сталі паўнапраўнымі гаспадарамі. Калі я ехала да біёлагаў, то спадзявалася пачуць шмат слоў радасці, захаплення новым корпусам, лабараторыямі. Але гэтага не было. Убачыла я там шмат цікавага. Ды пра гэта яшчэ наперадзе.

Аб жыцці на факультэце мне расказаў загадчык кафедры біяхіміі Славамір Аляксандравіч Струміла.

**— Славамір Аляксандравіч, скажыце, калі ласка, ці змянілася жыццё на факультэце, ці прынёс вам радасць новы будынак!**

— А як жа! Мы вельмі рады: наваселле для нас было святам! Шмат чаго змянілася для нас. Па-першае, павялічылася плошча, па-другое, палепшыліся ўмовы працы, ніхто нас не прыцясняе, як было раней, заняткі ў нас цяпер праходзяць у так званых практыкумах, абсталяванне атрымалі венгерскае, шмат такіх рэчаў, якіх не мелі раней. Зараз мы маем лабараторыі для навукова-даследчай работы, што вельмі важна для біёлагаў.

Славамір Аляксандравіч шмат гаварыў пра свае новыя радасці, але чула ў яго голасе нейкі жаль, шкадаванне, і не вытрымала, спытала:

**— А з якімі цяжкасцямі, недахопамі вы тут сустрэліся! Ці ўсё зроблена належным чынам!**

— Сустрэлі нас у новым корпусе не толькі радасці, але і праблемы, якіх нават больш у цяперашні час. Ды і ісці далёка не трэба, вы самі бачыце, у якіх умовах мы жывём. Куды ні кінь вокам — усюды недахопы. Корпус здадзены, але ж будаўніцтва яшчэ працягваецца. Мабыць, мы паспяшаліся з перасяленнем, дарэмна згадзіліся пераехаць сюды. Наогул, гаварыць прыходзіцца больш пра недахопы, якіх не пералічыць. Самае галоўнае, што нас цяпер больш за ўсё хвалюе, — гэта тое, што пакуль што ў корпусе няма прыточнай і выцяжной вентыляцыі. Без гэтага біяхімічныя лабараторыі існаваць не могуць. Толькі цяпер пачынаюць наладжваць зазямленне. Гэта тое, што павінна было рабіцца ў першую чаргу.

Яшчэ адно балючае пытанне — нашы склады, дзе захоўваюцца хімічныя рэактывы, посуд для хімічных рэактываў. Гэтыя рэчы павінны знаходзіцца ў бяспечных умовах. У нас жа не склады, а проста звалка. Наогул, трэба выклікаць санстанцыю, каб вырашыць пытанне.

Я слухала і бачыла, што гэты чалавек гаворыць праўду. Мне стала шкада студэнтаў-біёлагаў і выкладчыкаў. Хочацца звярнуцца да будаўнікоў і запытаць у іх: калі ж яны будуць працаваць не на калькасць, а на якасць? Ці захацеў бы хто з іх жыць і працаваць у пакоі, дзе брудныя вуглы на столі ад таго, што яна працякае, дзе на падлозе стаяць лужыны ад таго, што цякуць батарэі? Не стануць яны там жыць! А студэнты-біёлагі? Мары пра прыгожыя, утульныя кабінеты і лабараторыі не збыліся. Усё трэба рабіць сваімі рукамі. Славамір Аляксандравіч гаварыў, што выкладчыкі проста не абышліся б без студэнтаў. Менавіта яны, студэнты, дапамагалі пры перавозцы абсталявання, насілі ўсё, расстаўлялі... Яны і цяпер не ўбаку ад агульных спраў.

Так, будаўнікі здалі корпус і забыліся пра людзей, якія павінны ў ім працаваць. Да цяперашняга часу адсутнічае віварый (тэрмінова ён размешчаны ў туалеце, які таксама яшчэ не працуе).

Не працуе да гэтай пары і гардэроб. Студэнты распранаюцца ў калідорах, пакідаюць рэчы на падаконніках.

Мы бачылі, якія няроўныя ў корпусе лесвіцы, прыступкі рознага памеру, хадзіць вельмі нязручна. Такія ж няроўныя ў лабараторыях падлогі. Адсюль вынік: будавалі наспех, няякасна. А бедаваць прыходзіцца заказчыку і неяк выходзіць з плачэўнага становішча — таксама яму.

Няма тут сантэхніка. Няма і прыбіральшчыцы. Ужо два месяцы ніхто не прыбірае ў корпусе. Праўда, некалькі разоў дапамагалі студэнты, але іх справа — вучыцца.

— Гаварыць можна доўга, але словамі справе не дапаможаш, — зазначае С. А. Струміла. — Мы ўжо не раз звярталіся да адміністрацыі універсітэта, да прарэктара па АГР, звяртаемся яшчэ раз. Корпус патрабуе сур'ёзнай увагі адміністрацыі і гаспадарчых служб ва універсітэце. Трэба шукаць выйсце са становішча разам і хутчэй.

Не багаты факультэт на сродкі, але не бедны ён на добрых, шчырых, таленавітых людзей: выкладчыкаў і студэнтаў. Мінулая сесія прайшла ўжо ў новым корпусе. Студэнтаў сустрэлі новыя аудыторыі і лабараторыі. Заўсёды пры пераездзе нешта змяняецца. Студэнты яшчэ не паспелі прывыкнуць да новага абсталявання, да новых сцен, нават тое, што яны бачылі за вакном — таксама новае, яшчэ не прывычнае, не будзённае, нават колер, у які пафарбаваны сцены — усё гэта ўздзейнічае на студэнта. Усё гэта ў якойсці ступені рассейвае ўвагу на экзаменах і заліках. Але вынікі гэтай сесіі абнадзейваючыя. Зараз на біялагічным факультэце 36 студэнтаў, якія здалі экзамен на «выдатна» і «добра». Трэба думаць, што летняя сесіі будзе яшчэ больш паспяховай, таму што павінны палепшыцца ўмовы для вучобы.

Славамір Аляксандравіч гаварыў, што пры наяўнасці плошчы, неабходных лабараторый у біялагічнага факультэта з'явілася магчымасць дапамагчы іншым факультэтам. Зараз там праводзяць практычныя і індывідуальныя заняткі студэнты факультэта фізічнай культуры, за што яны ўдзячны біёлагам. Фізкультурнікі вывучаюць у біялагічных лабараторыях анатомію і іншыя прадметы.

**— А якія ж планы на будучае!**

— Планаў шмат. Але ўсе надзеі на лета. За лета, думаем, будуць добраўпарадкаваны тэрыторыя нашага корпуса, лабараторыі таксама. Мы хочам, каб увосень нашы студэнты прыйшлі ў сапраўды новы корпус, як след абсталяваны. Каб прыходзілі яны сюды з добрым, бадзёрым настроем, каб ім сапраўды хацелася вучыцца. Тады і будзе сапраўднае наваселле. Адным словам, праблем у нас шмат.

На кафедры біялагічнай хіміі я бачыла ўжо купленыя шпалеры для абклейвання сцен. Гэта значыць, што выкладчыкі і студэнты не сядзяць, склаўшы рукі.

Хутка на біялагічным будзе свята — Дні факультэта, дзе студэнты і выкладчыкі яшчэ пакажуць сябе, дзе мы ўбачым шмат талентаў, радасці, смеху...

## Зварот

**супрацоўнікаў біяфака да прарэктара па АГР т. Саўчука Я. А.**

**Глыбокапаважаны Яўген Антонавіч!**

**Калі Вы ўрэшце знойдзеце час, каб па-сапраўднаму заняцца нашым корпусам! Вы добра ведаеце, што доблесныя будаўнікі не здаюць аб'екты пад ключ. Наша перасяленне, выкліканае перш за ўсё цеснатой ва універсітэце, націскам з боку адміністрацыі ператварылася з радасцей у пакуты. Таму мы пытаемся ў Вас:**

**— Калі будзе ўведзена ў строй прыточна-выцяжная вентыляцыя ў хімічных лабараторыях і практыкумах!**

**— Калі будзе абсталяваны склад для хімічных рэактываў і віварый для жывёлы!**

**— Калі будзе адрамантаваны дах!**

**— Калі Вы прымусіце сваіх падначаленых — сантэхніка і цясляра, займацца сваімі прамымі абавязкамі на нашым аб'екце!**

**— Калі пачнецца выкананне патрабаванняў санэпідэмстанцыі і надзору па тэхніцы бяспекі!**

**— Мы мерзнем у памяшканнях пры плюсавой тэмпературы паветра. А што будзе ў суровую зіму!**

**Супрацоўнікі біяфака чакаюць Вас у сваім новым доме. Прычым з надзеяй на пэўную дапамогу.**



**Так, студэнтаў факультэта фізічнай культуры на біяфаку гасцямі ўжо не назавеш. У гэтых юнакоў і дзяўчат — індывідуальныя заняткі па батаніцы. Вывучаюць мікраскоп.**



**У кабінеце анатоміі мы сустрэліся з выдатнікамі вучобы, таксама студэнтамі факультэта фізічнай культуры.**

**Злева-направа: Наталля Пятушок, Дзмітрый Таланаў, Святлана Ткачык.**

**Студэнты — народ вясёлы. У час здымкі таксама не абышлося без жартаў...**

# «Наднёманскія галасы»

## Лірычная альтэрнатыва

**Пры татальным выражэнні густаў дылема «падабаецца — не падабаецца» абсалютна нічога не вырашае. Таму я ўстрымаюся ад выказвання свайго гледзішча, абмовіўшыся, што мае густы крыху кансерватыўнейшыя, чымся аўтаравы. Гэтыя вершы халодныя, як жыццё па смерці. Яны альтэрнатыўныя ўсебакова, нават у адносінах да лірызму. І такая якасць з цягам часу праяўляецца ўсё больш паслядоўна. Што ёй прычынаю! Магчыма жыццё, прадукцыя літаратурных бацькоў-папярэднікаў. Тут, несумненна, і ўздзеянне новамаскоўскай хвалі. Рэальнасць жа альтэрнатывы пацвердзіць практыка, друкаванне.**

**ЮРАСЬ ПАЦЮПА.**



**Юрый ГУМЕНЮК. Нарадзіўся ў 1969 годзе (Гродна). Піша вершы з 1984-га. Удзельнік верш-гурта «Дыяген».**

**Вучыцца на руска-польскім аддзяленні філалагічнага факультэта.**

### ЗАБЫТЫЙ ГОЛОС

Наблюдаю воздушные замки
В глубине леденящих зеркал...
На вершинах изломанных скал
Развеваются чьи-то останки.
Сердцу слышится
голос случайный,
Он струится из трещин земных.
Голос предков далеких, родных
Покрывается дымчатой тайной.
Разливаются вязкие вина,
Серебрятся, как будто снега,
Размывают мои берега
Голубые глаза исполина.
А затем, словно лава вулкана,
Словно море горящих камней,
Лимонад отживающих дней
Разрывает стенки стакана...
Так и голос, забытый когда-то,
Заструится из трещин земных,
Голос предков далеких, родных
Водопадом зажгется на скатах.
И исчезнут воздушные замки
В глубине леденящих зеркал.
На вершинах изломанных скал
Оживут неживые останки.

1987 г.

### У ПРОПАСТИ

Мы на грани огромнейшей
пропасти.
Еще миг — и уйдем в Никуда.
Измельчат нас железные
лопасти,
И размоет гнилая вода.
Еще миг —
и забудем все горести,
Улетим в бесконечную даль.
Измельчат нас железные
лопасти.
Мы погибнем. Былого не жаль.

1987 г.

### ЭРОТИЧЕСКИЙ БРЕД

А любишь ли ты
эротический бред,
Когда извиваются два силуэта,
Когда разливается
фосфорный свет
И слышишь дыхание
вплоть до рассвета?
А любишь ли видеть
в кривых зеркалах
Наивно-смешные
зубастые рожи?
Они вызывают улыбку,
не страх,
Они друг на друга
совсем не похожи.
А любишь ли ты
за пространством морей
Увидеть лохматые вязкие тучи?
Смотри: закарабкался
Гиперболей
На сверхнеприступные
снежные кручи.
Эх, все это старый,
зализанный бред...
Но вот извиваются два силуэта,
И вновь разливается
фосфорный свет
И слышишь дыхание
вплоть до рассвета

1987 г.

### ПОСЛЕДНИЙ ЧАС

Просыпаюсь. Дикий хохот
Плетью хлещет по лицу.
Чей-то адский громкий топот
Рушит памятник Отцу.
За окном шагают толпы,
Миллионы рук и ног.
Сколько дней,
минуток сколько
Нужно, чтоб прожить я смог?
Нарушается дыханье,
Сердце прыгает в груди,
Слышу скорбное рыданье
За домами, впереди.
Что творится! что творится!
Неожиданный сюрприз!
Скоро город обнажится,
Будет массовый стриптиз.
Все деревья голы-голы,
Зажигаются поля,
Рассыпаются костелы,
Стонет бедная земля.
И смеются злые маски,
Но не видно подлых глаз.
Позабыты сны и сказки,
Наступил последний час.

1987 г.

### РИФМЫ-СТРЕЛЫ

Я плююсь смертоносными
рифмами,
Жажду новых железных рифм,
Чтоб разрушить коралловый риф
И умчаться с весенними
вихрями.
Рифмы-стрелы несутся
по воздуху,
Подражают живых мертвецов,
Поджигают подъезды домов
И на Запад несутся без отдыха,
Чтоб оттуда лететь на Восток.

1987 г.

### ТРАУРНОЕ ТАНГО

Танго траурного цвета
Будоражит сердце ночи.
Ночь безумная раздета,
Ночь не знает кто ЧТО хочет.
Ты заснуть уже не в силах
(Слышен рокот вертолетный),
Танго сон остановило
Просто так, бесповоротно.
Лунный фосфор сверлит
стенку,
На ковер летят осколки,
Музыкальные оттенки,
Тоньше маленькой иголки.
Сознаешь, что день скончался.
Пережил — и слава Богу!
Но в душе твоей остался
След, пророчащий тревогу.

1988 г.

### ПОГОНЯ

**Памяти Юргиса Балтрушайтиса**

В безбрежности мчатся
крылатые кони,
Крылатые кони потерянных дней,
Отлитые в царстве
подлунных теней
Для дикой
заоблачно-звездной погони.
Как бурные волны,
как белая пена
Они ударяются в груды
камней,
Крылатые кони потерянных
дней
Бежавшие с ветром
из вражьего плена.

1987 г.

### ДЕНЬ

День сегодняшний как будто
Не похож на день вчерашний:
То ли нетто, то ли брутто,
Хоть в пальто, но без рубашки.
То ли утро, то ли вечер,
Не светлеет, не темнеет,
Не то солнце, не то ветер,
То ли греет, то ли веет.
Или нетто, или брутто?
Мне теперь совсем
не страшно —
День сегодняшний как будто
Не похож на день вчерашний.

1989 г.

### ИНДИВИД

Вниз головой висеть отлично,
Ты видишь мир наоборот!
Но только что-то непривычно,
Болит измученный живот.
Не помешает стресс и рвота,
Понос или кишечный спазм,
Глотать насущный хлеб охота,
Когда не чувствуешь маразм.
Весь точно соковыжималка,
Жмешь информации плоды.
А если над тобою палка,
То не туды и не сюды.
Весь точно ручка кофемолки,
Язык, как пыльный половик.
Твои сестренки — комсомолки,
Дед — старосветский
большевик.
Вниз головой висеть отлично
(Весь мусор в голову течет).
Прохожий каждый
скажет лично:
«Висит какой-то идиот!»
Висишь? — Виси!
Пусть киснет мина,
Пусть захохочет инвалид.
Я не стиральная машина,
А беспристрастный индивид.

1989 г.

### ЖИЛЕЦ РЕЗЕРВУАРА

Я жилец резервуара.
В моем доме все красиво:
Водосброс для писуара,
Апельсин из Тель-Авива
И конфетница на полке
Постаревшего серванта,
Круглый стол, цветы-иголки,
Фото киноинтриганта.
Я рисую атмосферу.
Моя кисть — простые грабли
Чертят наглую гетеру
В безразмерном дирижабле.
На экране обезьяна
Комментирует поездку,
Я лежу в углу дивана
Сочиняю суперпьеску.
Остальное все «до фени»,
Даже вой локомотива
И шальные светотени
В центре телеобъектива,
Даже то, что в венах реки
Сена, Марна и Луара.
Не нуждаюсь я в опеке,
Я — жилец резервуара.

## З УСМЕШКАЙ

### НАВУКОВАЯ ГІСТОРЫЯ, АБО

**некалькі парад па напісанню дысертацыі маладой аспірантцы**

Аспірантка Шапкіна натыкнулася ў магазіне дамскіх капялюшыкаў на свайго навуковага кіраўніка прафесара Аўсеева.

— Шапкіна! Вы мне патрэбны. Вам, дзяўчына, да 8-га сакавіка дысертацыю падаваць. Як у Вас справы?

— Укалываем, — адказала крыху разгублена Шапкіна. Трэба сказаць, што яна сапраўды была вельмі заняты чалавек у любоўных справах. — У мяне эксперымент яшчэ не ўвесь зроблены, — сказала Шапкіна, змаўчаўшы аб тым, што не зроблена нічога.

— Тым горш для эксперыменту — працытыраваў вядомы «акадэмічны» афарызм прафесар. — Вазьміце мае старыя даныя, перабудуйце графікі, павялічце маштаб. Толькі аб'ём не раздувайце: 100 старонак тэксту, 40 малюнкаў, 9—12 табліц. Даклад — не больш 15 хвілін. Паважайце апанентаў і членаў савета: яны ж людзі занятыя.

Натхнёная навуковым кіраўніком, Шапкіна 1-га сакавіка паклала дысертацыю на стол.

— Я ў жніўні мінулага года ў санаторыі адпачываў з прафесарам Арловым, дык мы яго возьмем першым апанентам, а другога падбярыце самі,—прапанаваў Аўсееў, — Рыхтуйце абарону, паважаная. Ні пуха!

Шапкіна аж засвяцілася ад шчасця. Але асноўная работа была наперадзе. Спачатку Шапкіна доўга збірала бясконцыя паперы, афармляла розныя дакументы, пісала на сябе станоўчыя характарыстыкі. Потым пайшла да апанентаў.

— Згодны, — сказалі апаненты. — Толькі водзывы самі рыхтуйце. Няма ў нас часу — навуку рухаць трэба!

Шапкіна вырашыла парадзіцца з шэфам.

— Пішыце, пішыце, — сказаў Аўсееў. — Каму патрэбна кандыдацкая, ім, ці вам? Дарэчы, водзыў навуковага кіраўніка таксама час пісаць.

— Але ці добра гэта? — засумнявалася Шапкіна. — Лепш бы вы... У мяне можа атрымацца недастаткова крытычна.

— Вы ўжо амаль што кандыдат навук: час адчуваць сябе вучонай. А ў мяне такіх, як Вы, шмат. Калі ўсім водзывы пісаць, дзе я знайду час, каб чытаць навуковую літаратуру?

Потым Шапкіна падрыхтавала аўтарэфераты і стала разносіць іх у розныя арганізацыі — спецыялістам. Усе спецыялісты згаджаліся даць добры водзыў, але катэгарычна адмаўляліся яго пісаць.

Шапкіна забылася, што такое сон...

Абарона прайшла добра. Толькі адно з пытанняў здалося Шапкінай незнаёмым, і таму яна не стала на яго адказваць, сказаўшы толькі:

— Гэта праблема ў данай працы спецыяльна не даследавалася.

Наперадзе былі яшчэ банкет, развоз членаў савета па хатах, пасадка апанента Арлова на хуткі цягнік.

Працавала Шапкіна так, што давялося потым доўга адпачываць...

Нарэшце пайшла за дакументам.

— А, прыйшлі, нарэшце, — сказалі ёй. — Усе ўжо даўно атрымалі. Сядайце і выпісвайце сабе дыплом. Вось узор...

**Запісаў В. ТАРАНЦЕЙ у аспірантуры АПН СССР у 1978 г.**

## З КАЛЕНДАРА СПАРТЫЎНАГА КЛУБА

Спартыўны клуб і прафсаюзны камітэт студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы арганізаваў спаборніцтвы па баскетболу ў праграме спартакіяды. У іх прынялі ўдзел жаночыя зборныя каманды факультэтаў. На працягу пяці дзён у спартыўнай зале Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы праходзілі ўпартыя паядынкі. Без паражэнняў прайшла ўвесь турнір дружная каманда філалагічнага факультэта, якая і заняла 1 месца. На другім месцы — дзяўчаты біялагічнага факультэта, на трэцім — будучыя правазнаўцы.

Лепшымі ігракамі турніра прызнаны Ж. Венская, студэнтка 2 курса філалагічнага факультэта, І. Сарокіна, студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта, Ж. Максімік, ст-ка І курса факультэта правазнаўства, Э. Едэшка, ст-ка 5 курса біяфаку.

* * *

У веснавы перыяд адбудуцца наступныя спаборніцтвы ў праграме спартакіяды:

1. Валейбол (мужчыны, жанчыны) — сакавік.
2. Барацьба класічная — сакавік.
3. Мнагабор'е ГПА — красавік.
4. Стральба пулявая — красавік.
5. Футбол — красавік.
6. Веснавы крос — красавік.
7. Лёгкая атлетыка — май.
8. Плаванне — май.

* * *

У Віцебску з 9 па 11 сакавіка праходзіў усесаюзны турнір па класічнай барацьбе памяці генерала Даватара. Студэнт 1 курса факультэта правазнаўства Алег Бандарэнка заняў 1 месца ў вагавай катэгорыі да 90 кг і выканаў нарматыў майстра спорту СССР. Поспех і радасць перамогі раздзяляюць трэнеры спартсмена — заслужаны трэнер СССР В. А. Максімовіч і А. А. Кудзель.

* * *

У Горках завершаны спаборніцтвы барцоў вольнага стылю ў праграме спартакіяды ВНУ БССР. Каманда Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы заняла IV месца. На вышэйшую ступень п'едэстала гонару падняўся майстар спорту, слухач падрыхтоўчага аддзялення ГрДУ імя Я. Купалы Мурад Айгулаў. Паказаўшы яркую барацьбу, ён стаў пераможцам у вагавай катэгорыі да 62 кг. Другое месца ў вагавай катэгорыі да 90 кг заняў студэнт факультэта фізічнага выхавання, кандыдат у майстры спорта Ігар Баярчук. Чацвёртыя месцы — у майстра спорта А. Семакова і кандыдата ў майстры спорта В. Крука.

Наш адрас:
236023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-38-70

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул. Паліграфістаў, 4.

Тыраж 2000 экз.
Зак. 2667. АИ 02096.

Рэдактар
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.